

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Працягваем вучыцца здароваму харчаванню з дапамогай доктара медыцынскіх навук Элеаноры Капітонавай. Тым больш, што наперадзе шмат святочных — калядных і навагодніх — застолляў.**

СТАР 7



**Ісці па жыцці з усмешкай — няпроста. Пры гэтым паспяваць заваёўваць медалі, трэніравацца шэсць разоў на тыдзень, знаходзіць час на добрыя ўчынкі і заставацца шчырым і добразычлівым чалавекам.**

СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 СНЕЖНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 246 (27361) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

# УРАД ПЕРАКОНВАЕ ПАРЛАМЕНТ У НЕАБХОДНАСЦІ КАРЭКЦІРОЎКІ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

**Гэтую карэкціроўку віцэ-прэм'ер Анатоль ТОЗІК бачыць у тым, каб у краіне былі перагледжаны адносіны да дзяржаўнай падтрымкі. «Менш прасіць і больш разумна выкарыстоўваць тое, што ёсць» — такі лейтматыў новай дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы.**

Апошні раз намеснік прэм'ер-міністра, які курыруе сацыяльную сферу, трымаў адказ перад дэпутатамі абедзвюх палат беларускага парламента больш як год таму. За гэты час сацыяльная сфера развілася задавальняюча, паведаміў парламентарыям Анатоль Тозік. У краіне растуць заробкі і пенсіі, фактычна адсутнічае беспрацоўе, прымаюцца меры па папярэджанні адтоку кадраў, самадастаткова развіваецца медыцына і адукацыя, падтрымліваюцца сем'і, якія выхоўваюць дзяцей.

Разам з тым, у Беларусі ёсць спецыфічная праблема, якая, па меркаванні віцэ-прэм'ера, можа хутка пераўтварыцца ў пагрозу для яе паспяховага развіцця. Гэта праблема ўтрыманскіх адносін грамадзян.

— Нам крайне важна адыходзіць ад залішняй апекі людзей. На жаль, значная частка насельніцтва нашай краіны (і, што сумна, працаздольнага ўзросту і моладзь) знаходзіцца ў палоне ілюзій пра бясплатнасць паслуг у адукацыі, ЖКГ, медыцыне, культуры, спорце і гэтак далей, — сказаў ён. — Дапамагаць трэба таму, хто ў гэтым мае патрэбу. Урад разумее, што зарплаты ўрачоў, настаўнікаў, работнікаў устаноў культуры, спорту, сацыяльнай абароны павінны быць значна вышэйшыя. Але сацыяльная сфера не мае маральнага права больш нагружаць рэальны сектар эканомікі. Рэзервы трэба шукаць унутры сваіх галін. Па падліках віцэ-прэм'ера, у адукацыі і спартыўнай галіне да 25-30% бюджэтных сродкаў расходуюцца неапраўдана, у ахове здароўя і культуры — да 15%.

Другой крыніцай павышэння заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы Анатоль Тозік назваў самастойны заробак грошай. Ён лічыць неабходным перагледзець сённяшнюю сістэму аплаты працы педагогаў, якая ў многім мае характар ураўнілаўкі і не стымулюе да павышэння якасці работы. З 1 верасня 2013 года плануецца пачаць эксперыментальную апрабацыю галіновай сістэмы аплаты працы, распрацаванай Міністэрствам адукацыі. Яна прадугледжвае аплату працы ў залежнасці ад інтэнсіўнасці, якасці і дасягнутых вынікаў.

«Такія ж магчымасці і рэсурсы ёсць і ў сістэме прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у вышэйшай школе, а таксама ва ўсіх без выключэння бюджэтных галінах», — заўважыў віцэ-прэм'ер.

— Нам трэба карэкціраваць сацыяльную палітыку, бо калі ў чалавека ёсць рукі-ногі, то ён павінен сам зарабляць на сябе і сваю сям'ю, а не жыць па прынцыпе: «Шукаю заробкадаўцу, работадаўцу прашу не турбаваць».

Сёння нас гэта вельмі трывожыць. Нам трэба больш надаваць увагі рэальнаму сектару эканомікі. Калі мы там даб'ёмся поспехаў, то і сацыяльная сфера атрымае больш.

Віцэ-прэм'ер у сваім дакладзе назваў негатыўнай сітуацыю, якая склалася па выніках года, калі рост заробкаў апярэджвае рост вытворчасці працы больш чым на 4%. Анатоль Тозік звярнуў увагу на тое, што калі параўноўваць заробкі ў розных краінах па парытэце пакупніцкай здольнасці, то атрымаецца зусім іншая карціна, чым прынята лічыць. Па методыцы міжнародных супастаўленняў 2008 года (калі ўлічыць усе «бясплатныя» паслугі, якія маюць беларусы), сярэдні заробак у Беларусі сёлета перавысіў 1 200 долараў, здзівіў усіх віцэ-прэм'ер.

Пасля даклада Анатоль Тозік адказаў на пытанні 23 дэпутатаў Нацыянальнага сходу. Гэта пры тым, што напярэдадні пасяджэння парламентарыі атрымалі адказы і на свае пісьмовыя пытанні. **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Уладзімір ШЫЦЬКО** выказаў сумненні ў эфектыўнасці сённяшняй сістэмы падрыхтоўкі юных спартсменаў. Анатоль Тозік не пагадзіўся з тым, што лепшага ў дзіцячых спартыўных школах часта вызначаюць сімпатыі трэнераў, а не талент і здольнасць вучня. Разам з тым, ён адзначыў, што 40% вучняў спартыўных дзіцячых школ прыходзяць туды не таму, што маюць асаблівыя здольнасці ў спорце, а для забеспячэння заробку трэнераў. Ненармальна і тое, што 40% выпускнікоў спартыўных вучылішчаў пакідаюць спорт.

Шмат пытанняў датычылася праблем у сферы адукацыі і аховы здароўя. Віцэ-прэм'ер выказаўся за скарачэнне прыёму ў педагагічныя ВНУ краіны, за завяршэнне рэформаў у адукацыі і за тое, каб любыя рашэнні ў сферы адукацыі, у тым ліку і па павелічэнні навучальнага года, прымаліся ў інтарэсах дзіцяці. Ён таксама заўважыў, што пытанне аб павышэнні ўзросту выхаду на пенсію ў Беларусі знята і ў бліжэйшы час абмяркоўвацца не будзе. Анатоль Тозік паведаміў, што ў 2014-2015 гадах запланавана рэалізацыя пілотнага праекта, у рамках якога будуць апрабаваны дадатковыя формы падтрымкі сем'яў пры нараджэнні другога дзіцяці.

Дэпутаты прапаноўвалі і канкрэтныя захады: дазволіць мясцовым бюджэтам аплачваць навучанне будучых урачоў, прывабіць прыватных інвестараў да аднаўлення гістарычных будынкаў, павысіць адказнасць абавязаных асоб за парушэнне працоўнай дысцыпліны, спрасціць механізм фарміравання заробкаў, распрацаваць заканадаўчы акт па абароне культурных і гістарычных каштоўнасцяў ад «чорных капальнікаў»...

З большасцю прапаноў віцэ-прэм'ер пагадзіўся. У сваю чаргу, ён папрасіў падтрымаць законапраект, які будзе прадугледжваць канфіскацыю аўтамабіля ў п'янага кіроўцы, незалежна ад таго, каму аўтамабіль належыць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**



# ДЗЕДА МАРОЗА ВЫКЛІКАЛІ?

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

**У передсвяточныя дні аддаленыя вёскі і населеныя пункты без стацыянарных магазінаў Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці наведваюць аўталаўкі з вадзіцелем — Дзедам Марозам і прадаўцом — Снягуркай. Перад Калядамі і Новым годам раённае спажывецкае таварыства Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці арганізавала перадсвяточны гандаль.**

**Круглы год сем дзён у тыдзень 6 спажывецкіх і 1 прамысловая аўталаўкі наведваюць 168 вёсак Дзятлаўскага раёна (а гэта 3341 жыхар). У спажыўарганізацыі распрацаваны 3 маршруты. Кожную вёску аўтакрамы наведваюць 2—4 разы на тыдзень. Пакупнікі, акрамя стандартнага набору прадуктаў, могуць зрабіць заказ прадаўцу «крамы на колах», у тым ліку халадзільнік або пральную машыну.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Антон КРАЕЎСКІ, старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама:**

***«Рэальная заработная плата ў Мінску за 2013 год павінна ўзрасці на 5%. Перад горадам стаіць задача дасягнуць узроўню сярэднямесячнай заработнай платы ў памеры Br5 млн 880 тыс. (сёлета ў студзені—кастрычніку гэты паказчык склаў Br4 млн 575,1 тыс.). Даходы насельніцтва будуць залежаць ад работы рэальнага сектара эканомікі. Неабходна забяспечыць тэмп росту прадукцыйнасці працы, які будзе перавышаць тэмпы росту заробкаў».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 15° |
| Віцебск | – 14° |
| Гомель | – 11° |
| Гродна | – 14° |
| Магілёў | – 14° |
| Мінск | – 14° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8550,00 | ■ |
| Еўра | 11310,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 278,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1055,36 | ▼ |

# БЫЦЬ ПАРЛАМЕНТАРЫЕМ — ЗНАЧЫЦЬ, БЫЦЬ У АДКАЗЕ ЗА КРАІНУ, ЗА СВОЙ НАРОД

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава А.М. на закрыцці першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання 20 снежня 2012 года*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Сёння завяршаецца першая сесія Савета Рэспублікі пятага склікання. Мы з вамі прапрацавалі першыя два месяцы, і, як мне здаецца, новыя члены Савета Рэспублікі нядрэнна асвоіліся са сваімі функцыямі, актыўна ўключыліся ў заканатворчую дзейнасць. Важна, што нашы камісіі наладзілі цеснае ўзаемадзеянне з профільнымі камісіямі Палаты прадстаўнікоў, а таксама тое, што з самага пачатку быў узяты курс на прыцягненне грамадскасці да абмеркавання законапраектаў, якія разглядаюцца. Нашы сенатары сумесна з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў правялі шэраг семінараў і «круглых» сталоў па важнейшых для краіны законапраектах.

У выніку ўсёй гэтай работы Савет Рэспублікі разгледзеў і адобрыў каля двух дзясяткаў законаў. Прынятыя намі прававыя акты накіраваны на развіццё рэкламнага рынку, удасканаленне сістэмы дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, рэгуляванне адносін у галіне аховы і выкарыстання зямель, аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету, спрашчэнне ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур у галіне прыродакарыстання.



Шэраг разгледжаных законапраектаў прадугледжвае развіццё прававой базы міжнароднага супрацоўніцтва. Дзякуючы іх прыняццю сёння больш дакладна адрэгуляваны пытанні супрацоўніцтва нашай краіны з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі ў энергетычнай і мытнай сферах, у галіне гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, адукацыі і турызму.

Мы таксама прадоўжылі ўдасканальваць прававую базу Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Прынятыя прававыя дакументы накіраваны, у першую чаргу, на забеспячэнне максімальнай эфектыўнасці работы эканамічных механізмаў гэтых інтэграцыйных структур.

Асаблівая ўвага ў перыяд сесіі намі ўдзялялася міжнароднай і міжпарламенцкай дзейнасці. У Савеце Рэспублікі сфарміравана 13 дэлегацый Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у міжпарламенцкіх арганізацыях.

СТАР 2

# ПРАЦАВАЦЬ З БОЛЬШАЙ АДДАЧАЙ, ПРАЦАВАЦЬ НА МАКСІМАЛЬНЫ ВЫНІК

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на закрыцці першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*

Паважаныя дэпутаты, запрошаныя, журналісты!

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння, 20 снежня 2012 года, завяршае работу першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Парадак дня вычарпаны. Усе арганізацыйныя пытанні вырашаны аператыўна. Сфарміраваны рабочыя органы Палаты прадстаўнікоў. Пры ўтварэнні пастаянных камісій у першую чаргу ўлічваліся прафесійная падрыхтоўка і практычны вопыт дэпутатаў. Наладжана ўзаемадзеянне з усімі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу. Гэта дало магчымасць дэпутацкаму корпусу хутка ўвайсці ў рабочы рэжым і пачаць вырашэнне пастаўленых перад Парламентам задач з улікам прыярытэтаў, абазначаных кіраўніком дзяржавы.

У ходзе сесіі разгледжана 30 законапраектаў. Зразумела, колькасць не галоўны крытэрый парламенцкай дзейнасці.



Але для першай сесіі, улічваючы яе арганізацыйны характар, гэта немалаважна, тым больш што шэраг прынятых дакументаў мае прынцыповае значэнне для краіны.

Адным з ключавых напрамкаў унутранай палітыкі дзяржавы з'яўляецца вырашэнне дэмаграфічнай праблемы. І дэпутаты ўносяць важны ўклад у рэалізацыю комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне.

Праект Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» закранае інтарэсы практычна кожнай беларускай сям'і. Пагадзіцеся, што значнае павелічэнне памераў дапамог па цяжарнасці і родах, па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў — гэта добрая прыбаўка да сямейнага бюджэту.

Прыярытэтная ўвага на сесіі была ўдзелена законапраектам эканамічнага блока. Перад рэальным сектарам эканомікі сёння як ніколі востра стаяць пытанні паскарэння тэхналагічнага пераўзбраення, пашырэння выкарыстання мясцовых сыравінных рэсурсаў, стварэння высокаэфектыўных рабочых месцаў. Вырашэнне гэтых задач залежыць непасрэдна ад аб'ёму прыцягнутых інвестыцый. На гэта накіраваны праект Закона «Аб канцэсіях», прыняты на гэтай сесіі ў першым чытанні.

СТАР 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПУЦІНУ НЕ ХАПІЛА 8 ХВІЛІН ДА РЭКОРДУ ПРАЦЯГЛАСЦІ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЙ



Прэс-канферэнцыя, якую правёў 20 снежня прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін, працягвалася з 12:00 да 16:33. Такім чынам, Пуціну не ўдалося пабіць уласны ж рэкорд па працягласці падобных сустрэч. Папярэдняя прэс-канферэнцыя, якая адбылася ў 2008 годзе, доўжылася 4 гадзіны 40 хвілін.

Найбольшую колькасць пытанняў журналісты задалі на тэму так званага «закона Дзімы Якаўлева», які прадугледжвае забарону на ўсынаўленне амерыканцамі расійскіх дзяцей. Пуцін у адказ заявіў, што такая мера з'яўляецца эмацыйнай, але адэкватнай. Акрамя таго, Уладзімір Пуцін пракаментаваў «закон Сяргея Магніцкага». Ён назваў яго недружалюбным актам з боку ЗША. Падчас прэс-канферэнцыі Пуцін адказаў на пытанні пра «балотную справу», карупцыі, сваім здароўі, канцы свету і на шматлікія іншыя.

### ПЯЦІГАДОВАГА АФГАНЦА ПЕРАВОЗІЛІ Ў ЧАМАДАНЕ

Супрацоўнікі марскога порта Венецыі знайшлі пяцігадовае дзіця, якога такім чынам, як мяркуецца, спрабавалі правезці з Афганістана ў Германію.

Хлопчык быў знойдзены ў звычайным чамадане памерам 60 на 30 сантыметраў падчас праверкі багажу пасажыраў, якія прыбылі ў Італію на пароме з Грэцыі. Знаходзячыся ў валізцы, хлопчык не плакаў і не дрыжаў, хоць, відавочна, усё ж такі быў моцна напалоханы, паколькі пачашчана дыхаў. Дарэчы, дыхаць дзіця магло праз адтуліну, зробленую ў чамадане. Яго спрабаваў пранесці праз мытню мужчына, які вельмі дрэнна размаўляў па-італьянску. Ён назваўся спачатку бацькам, затым дзядзькам дзіцяці, а ўрэшце паведаміў, што ён сябар сям'і хлопчыка, чые бацькі жывуць у Грэцыі. Гэтаму 40-гадоваму беспрацоўнаму выхадцу з Афганістана, які жыве ў Італіі, прад'яўлены абвінавачванні ў спробе нелегальнай іміграцыі з абцяжарвальнымі акалічнасцямі. А хлопчык перададзены ў адну з венецыянскіх сем'яў, дзе будзе знаходзіцца да таго часу, пакуль сацыяльныя органы не прымуць рашэнне па гэтым няпростым выпадку.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ЗША РЭЗКА ВЫРАС ПОПЫТ НА ДЗІЦЯЧЫЯ КУЛЕНЕПРАБІВАЛЬНЫЯ ЗАПЛЕЧНІКІ



У дзень масавага забойства, 14 снежня, продажы куленепрабівальных заплечнікаў выраслі ў дзесяць разоў. Кошт іх складае 200-300 долараў. І хоць усе разумеюць, што заплечнікі не гарантуюць абароны дзяцей ад куль, аднак лічаць, што «лепш мець хоць нейкую абарону, чым ніякую». Дзецям раяць прыкрываць галаву і іншыя жыццёва важныя органы заплечнікамі ў выпадку нападу.

Стральба ў «Сэндзі Хук» справакавала таксама і рост попыту на зброю, асабліва на паўаўтаматычныя вінтоўкі AR-15. Менавіта такой вінтоўкай карыстаўся 20-гадовы Адам Лэнза. Такую ж вінтоўку ўлетку 2012 года выкарыстоўваў Джэймс Холмс, які забіў 12 чалавек у кінатэатры ў штаце Каларада. Кожны раз пасля такіх інцыдэнтаў у ЗША зноў узнімаецца пытанне пра ўвядзенне абмежаванняў на продаж і захоўванне зброі. Пасля забойства ў «Сэндзі Хук» ідэю забароны падтрымаў прэзідэнт ЗША Барак Абама.

КОРАТКА

Учора адначасова з апошняй выплатай купоннага даходу па купону № 8 на суму 151 млн 830 тыс. расійскіх рублёў Рэспубліка Беларусь пагасіла дэбютны выпуск дзяржаўных аблігацый, размешчаных на тэрыторыі Расіі 23 снежня 2010 года, на суму 7 млрд расійскіх рублёў.

Экспартна-імпартны банк Кітая выдзеліць Беларусі $280 млн 867,5 тыс. на стварэнне нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання, а таксама $322 млн на рэканструкцыю аўтамабільнай дарогі М-5/Е271 Мінск—Гомель на ўчастку Бабруйск—Жлобін.

З 1 студзеня 2013 года ў Беларусі ўводзіцца сістэма Tax Free — механізм вяртання ПДВ з беларускіх тавараў, набытых у рэспубліцы іншаземцамі. Мінімальны кошт пакупак пры вяртанні ПДВ павінен скласці Br800 тыс. Тавар павінен быць набыты ў адным магазіне на працягу аднаго рабочага дня. Суму падатку вяртаць не будуць у выпадках, калі тавар у Беларусі вызвалены ад ПДВ або па ім прымяняецца паніжаная стаўка (напрыклад, гэта датычыцца харчовых тавараў).

## НА СЁННЯ, 21 СНЕЖНЯ, «ПРАГНАЗАВАЎСЯ» КАНЕЦ СВЕТУ. ЦІ ВЕРЫЛІ ВЫ Ў ТОЕ, ШТО ГЭТА АДБУДЗЕЦЦА?



**Алена Каранеўская, загадчык аддзела карэспандэнцкай сеткі тэлеканала «АНТ»:**

— Канец свету не ўваходзіў у мае планы. Падрыхтоўка да гэтай падзеі абмежавалася толькі больш пільнай увагай да паводзін ката. Кажуць, што жывёлы першымі адчуваюць нядобрае. Раніцай паглядзела на гадаванца і зразумела, што давядзецца збірацца на працу. Тлумачальная тыпу: «не прыйшла, бо чакала канца свету!» — не пракаціць.



**Уладзімір Івашкевіч, карэспандэнт рэдакцыі раённай газеты «Жыццё Прыдзвіння»:**

— У канец свету не верыцца, таму што жыццё — гэта цудоўна! Тым больш што ў наступным годзе мне спаўняецца паўстагоддзя. За гэты час выгадаваў дзвюх дачок, дачакаўся ўнукаў. Калі кажуць, што дзеці — кветкі жыцця, то ўнукі — гэта наш шлях у Бессмяротнасць. І яшчэ — у аднаго з маіх знаёмых менавіта 21 снежня дзень нараджэння. Дык больш да гэтай падзеі рыхтаваўся...



**Уладзіслаў Заплітны, бізнэсмен:**

— Як чалавек, які адэкватна ўспрымае тое, што адбываецца ў рэчаіснасці, магу сказаць наступнае. На мой погляд, 21 снежня нічога не зменіцца, таму што, лічу, кожны нармальны чалавек павінен успрымаць тое, што адбываецца аб'ектыўна вакол яго, згодна са сваімі суб'ектыўным поглядам. Справа ў тым, што любыя змены, якія ўносяцца інфармацыйна ў наша жыццё, перш-наперш правяраюць людзей на псіхалагічную і прафесійную прыдатнасць... Тое, што людзі, а сярод іх ёсць і мае блізкія, пачыналі перад канцом свету «выратоўвацца»: нешта капаць, мітусіцца і гэтак далей — зразумела, што такім чынам праяўляюцца псіхічныя праблемы, якія назапасіліся. Я ўспрымаю ўсе тыя анамаліі, якія вакол мяне адбываюцца, адэкватна. Таму што зразумела: пасля дня наступае ноч і гэтак далей, як і пасля вясны — лета... І нікому не дадзена права ўмешвацца ў кругазварот прыроды. І я ведаю, што ні я, ні іншыя ўплываць на гэты кругазварот у прыродзе не могуць. Безумоўна, нейкія катаклізмы існуюць: вулканы, стыхійныя бедствы і гэтак далей. Але каб знішчыла нешта ўсю зямлю і наступіў нейкі калапс — ну, гэта проста для людзей з хворай псіхікай.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЫЦЬ ПАРЛАМЕНТАРЫЕМ — ЗНАЧЫЦЬ, БЫЦЬ У АДКАЗЕ ЗА КРАІНУ, ЗА СВОЙ НАРОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Завяршаецца фарміраванне 50 рабочых груп і 2 міжпарламенцкіх камісій па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў. Абноўлены склад камісіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве з Саветам Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі, чарговае пасяджэнне якой намечана правесці ў лютым 2013 года.

Аператыўнае фарміраванне дэлегацый дало магчымасць нам без прамаруджвання ўключыцца ў работу па пашырэнні знешнепалітычных інтарэсаў краіны ў рамках міжнародных парламенцкіх арганізацый. Так, шэраг нашых калег прынялі актыўны ўдзел у рабоце 43-й сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, праведзенай 18 снежня ў Маскве. Саюзныя парламентарыі прызналі паўнамоцтвы абноўленага складу беларускай дэпутацыі, унеслі змяненні ў склады камісій, прынялі план работы Парламенцкага Сходу і бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2013 год.

Плённа папрацавалі сенатары і ў рамках міжпарламенцкіх асамблей СНД, АДКБ і ЕўрАзЭС, дзе была агучана наша пазіцыя па далейшым развіцці інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы. Адбыліся сустрэчы са старшынёй Сената Казахстана К.А. Мамі, прадстаўнікамі Народнай скупшчыны Рэспублікі Сербія, пасламі В'етнама, Ірана і Грузіі, дэлегацыяй МЗС Францыі. Абмяркоўваліся стан і перспектывы гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва, а таксама шэраг іншых пытанняў.

Сёння міжнародны аспект дзейнасці Савета Рэспублікі набывае асаблівае значэнне. Як вы ведаеце, у шэрагу краін свету вельмі неспакойна. Пад лозунгамі барацьбы за дэмакратыю і правы чалавека ідуць разбуральныя працэсы, якія прыводзяць да вялікіх чалавечых і матэрыяльных страт і адкідаюць гэтыя краіны на многія дзесяцігоддзі назад. Усё гэта адбываецца пад аховай і па сцэнарыях уладароў свету, якія не саромеюцца ў выбары сродкаў для дасягнення сваіх мэт.

На жаль, не абыходзяць увагай яны і нашу краіну. Ідуць беспрэцэдэнтныя нападкі на яе незалежную палітыку. Прадаўжаецца практыка эканамічнага і палітычнага націску, прымянення розных санкцый і абмежавальных рэзалюцый. З 1996 года Еўрапарламент 117 разоў заслухоўваў пытанне аб Беларусі і прымаў адносна нас розныя негатыўныя рэзалюцыі.

У сувязі з гэтым, нагадаю вам, паважаныя калегі, што цяпер Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай больш як трох з паловай тысяч міжнародных дагавораў, з якіх амаль дзве тысячы — двухбаковыя, амаль паўтары тысячы — шматбаковыя. Як бачым, у нас сфарміравана салідная прававая аснова супрацоўніцтва з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. Таму трэба выкарыстоўваць высокія трыбуны міжпарламенцкіх арганізацый і міжнародных форумаў для аргументаванага давядзення нашых пазіцый да сусветнай грамадскасці і замежных калег. Паказваць ім нежыццяздольнасць двайных стандартаў, розных абвінавачанняў у адрас нашай краіны.

Важнейшым напрамкам для нас павінна стаць работа па ўмацаванні кантактаў у рамках інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы, з парламентамі прыгранічных дзяржаў і з тымі дзяржавамі, якія зацікаўлены ў раўнапраўным і ўзаемапаважлівым дыялогу з намі.

Прыярытэтным напрамкам дзейнасці Савета Рэспублікі з'яўляецца сувязь з рэгіёнамі. Менавіта членам Савета Рэспублікі дэпутаты мясцовых Саветаў даверылі прадстаўляць і падтрымліваць іх інтарэсы ў вышэйшых эшалонах улады. Павінен адзначыць, што многія з вас актыўна асвойваюць новае для сябе поле дзейнасці. Аб гэтым сведчыць ваш удзел у пасяджэннях выканкамаў, сесій і прэзідыумаў мясцовых Саветаў, на якіх разглядаюцца жыццёва важныя для рэгіёнаў пытанні. Акрамя таго, шэраг членаў Савета Рэспублікі зацікаўлена ўзаемадзейнічаюць з міністэрствамі і ведамствамі краіны. Аб гэтым, у прыватнасці, можна меркаваць і па пытаннях, якія задаюцца сенатарамі на сумесных пасяджэннях палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Хоць адзначу, што тут мы маглі б быць больш актыўнымі.

Важнае месца ва ўмацаванні сувязяў з рэгіёнамі займае дзеючы пры Савеце Рэспублікі Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Пад яго эгідай на базе Жодзінскага гарадскога Савета 12 снежня праведзены семінар-практыкум для старшынь гарадскіх Саветаў дэпутатаў. Цяпер рыхтуецца чарговае пасяджэнне Савета, на якім плануецца разгледзець пытанне аб рабоце органаў кіравання і самакіравання Горацкага раёна і Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі па падрыхтоўцы і замацаванні кадраў у вёсцы.

У бліжэйшы час мы плануем абнавіць склад Савета па ўзаемадзеянні, уключыўшы ў яго новых, найбольш актыўных і зацікаўленых кіраўнікоў сельскіх і раённых Саветаў дэпутатаў. Будзе таксама сфарміраваны дзейсны механізм маніторынгу значных для насельніцтва праблем. Гэта дасць магчымасць яшчэ ў большай меры наблізіць членаў Савета Рэспублікі непасрэдна да патрэб людзей. Вынікі гэтай работы будуць шмат у чым залежаць і ад таго, наколькі цесна ўдасца выбудаваць узаемаадносіны з дэпутатамі мясцовых Саветаў, наколькі актыўна нашы сенатары, якія прадстаўляюць усе тэрытарыяльныя ўтварэнні, будуць выносіць хвалюючыя людзей пытанні на сесіі і прэзідыумы мясцовых Саветаў.

У сесійны перыяд шмат увагі ўдзялялася рабоце са зваротамі грамадзян, юрыдычных асоб і іх прадстаўнікоў. У Савеце Рэспублікі разгледжана 90 пісем і зваротаў. Людзей хвалююць работа жыллёва-камунальных службаў, а таксама пытанні сацыяльнай абароны, аховы здароўя, сям'і, мацярынства і дзяцінства. Ні адна заява не была пакінута без увагі, па кожнай прыняты канкрэтныя рашэнні.

Грамадзяне сталі актыўней звяртацца да нас пры дапамозе электроннай пошты. Толькі за сесійны перыяд электронныя звароты склалі каля 30 працэнтаў у агульным аб'ёме зваротаў, якія паступілі ў Савет Рэспублікі. Людзі, у прыватнасці, уносілі прапановы аб узмацненні адказнасці вадзіцеляў за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення, звярталі нашу ўвагу на нізкую якасць і высокі кошт жылля, што будуецца, парушэнне нарматыўных тэрмінаў капітальнага рамонту жылога фонду, адсутнасць цяпла ў кватэрах і інш.

У рэгіёнах дзякуючы вашай актыўнай пазіцыі, паважаныя члены Савета Рэспублікі, вырашаны шэраг няпростых жыццёвых праблем.

Так, пры непасрэдным удзеле намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Качанавай Наталлі Іванаўны вырашана пытанне забеспячэння цяплом памяшкання, у якім пражываюць удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Па просьбе грамадзян член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Мартынаў Мікалай Васільевіч садзейнічаў газіфікацыі вёскі Глінная Глыбоцкага раёна. Спіс добрых спраў сенатараў можна прадоўжыць і далей.

Многія з вас выступалі ў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ. Несумненна, вашы ўзважаныя і канструктыўныя выступленні будуць садзейнічаць павышэнню даверу насельніцтва да парламентарыяў, фарміраванню палітычнай і прававой культуры, стварэнню станоўчага іміджу вышэйшага заканадаўчага органа краіны.

Паважаныя калегі!

Сесія завяршаецца. Але гэта не значыць, што мы ідзём на парламенцкія канікулы. Работа ў камісіях, у рабочых групах над законапраектамі, у рэгіёнах, у міжпарламенцкіх групах будзе прадаўжацца.

Паколькі сенатар — гэта ўплывовая і аўтарытэтная фігура, і яго роля ў рэгіёне павінна быць адчувальнай. Таму ў перыяд сесійных канікул вы павінны асабліва актыўна ўзаемадзейнічаць з мясцовымі органамі ўлады, праводзіць прыёмы грамадзян, сустрэчы з калектывамі, выступаць у сродках масавай інфармацыі па бягучых пытаннях нашай палітыкі і мясцовага жыцця.

Як вы ведаеце, кіраўнік дзяржавы востра паставіў пытанне мадэрнізацыі нашай прамысловасці. Гэта важнейшая задача, якая сёння выходзіць на пярэдні план, без вырашэння якой нам будзе цяжка канкурыраваць на знешніх рынках. Асабліва ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы з улікам таго, што Расія ўступіла ў СГА. І мы, кожны на сваім рабочым месцы і ў сваім рэгіёне, павінны дапамагаць вырашэнню гэтай праблемы — пастаянна будзіраваць гэтыя пытанні, церабіць мясцовую выканаўчую ўладу, цікавіцца станам спраў на прадпрыемствах.

І другое пытанне. 2013 год пройдзе пад знакам Года беражлівасці. Рэалізацыя гэтай ідэі павінна садзейнічаць вырашэнню задач удасканалення арганізацыі вытворчасці, павышэння прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі і паслуг за кошт аптымізацыі расходаў, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, выключэння неабгрунтаваных страт. Адным словам, гэта яшчэ адзін важны крок на шляху павышэння прыбытковасці прадпрыемстваў, умацавання эканамічнай бяспекі дзяржавы ў цэлым.

І тут мы з вамі не павінны стаяць у баку.

У працоўных калектывах і па месцы жыхарства неабходна ўдзяліць увагу выхаванню ў нашых людзей пачуцця дбайнага гаспадара, стымулявання рэжыму эканоміі, асабліва на рабочых месцах.

Увогуле, усе гэтыя пытанні трэба ўключыць у планы вашай работы, а да пачатку наступнай сесіі, якая адкрыецца 2 красавіка, прадставіць старшыням вашых камісій кароткія справаздачы аб праведзенай вамі рабоце і рабоце вашых памочнікаў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

На заключэнне ад усёй душы хачу выказаць усім вам словы ўдзячнасці за сумесную работу ў перыяд першай сесіі. Першы экзамен мы з вамі здалі паспяхова.

Дазвольце мне ад вашага імя падзякаваць работнікам нашага Сакратарыята за належнае забеспячэнне дзейнасці Савета Рэспублікі пятага склікання.

Выказваю таксама ўдзячнасць акрэдытаваным журналістам за асвятленне нашай дзейнасці.

Сардэчна віншую ўсіх з надыходзячымі навагоднімі святамі! Жадаю вам і вашым блізкім у Новым годзе шчасця, дабра і здароўя!

Дзякуй за ўвагу!

# ПРАЦАВАЦЬ З БОЛЬШАЙ АДДАЧАЙ, ПРАЦАВАЦЬ НА МАКСІМАЛЬНЫ ВЫНІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Неабходна таксама ў самыя кароткія тэрміны завяршыць работу і над праектам Закона «Аб інвестыцыях», які ўзмоцніць абарону правоў і інтарэсаў інвестараў, забяспечыць празрыстасць і прастату ўмоў іх дзейнасці.

Яшчэ адна задача — рацыянальнае расходаванне энергарэсурсаў, што дасць магчымасць значна знізіць сабекошт выробленай прадукцыі. На гэта неаднаразова ўказваў кіраўнік дзяржавы, наведваючы праблемныя прадпрыемствы.

Дзейсным стымулам па зніжэнні энергаёмістасці беларускай эканомікі павінен стаць прайшоўшы стадыю першага чытання праект Закона «Аб энергазберажэнні». Улічваючы, што 2013 год аб'яўлены Годам беражлівасці, завяршыць работу над ім трэба ў самыя сціслыя тэрміны.

Упершыню на ўзроўні закона ўрэгуляваны такія сферы грамадскіх адносін, як выдавецкая дзейнасць, ахова камерцыйнай тайны. Мы імкнуліся максімальна напоўніць гэтыя прававыя акты нормамі прамога дзеяння. На тых жа прынцыпах грунтавалася і наша работа па карэкціроўцы заканадаўства аб міжнародных дагаворах, свабодных эканамічных зонах, рэкламнай дзейнасці. Дарэчы, мы нарэшце вырашылі пытанні скарачэння часу тэлевізійнай рэкламы, зніжэння ўзроўню гучнасці яе гуку, увядзення абмежаванняў на рэкламу піва і слабаалкагольных напіткаў.

У міжсесійны перыяд нас чакае таксама не менш сур'ёзная і адказная работа. Паколькі кожная новая норма павінна не проста адлюстроўваць змяненні, якія адбыліся. Мы павінны бачыць перспектыву, улічваць уплыў такіх фактараў, як развіццё еўразійскай інтэграцыі і наша імкненне стаць членам Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

Пры падрыхтоўцы праектаў законаў «Аб племянной справе ў жывёлагадоўлі», «Аб насенняводстве» і «Аб патэнтах на сарты раслін» неабходна дакладна расставіць акцэнты з улікам развіцця Адзінай эканамічнай прасторы, максімальна выкарыстоўваць усе яго перавагі і прадугледзець дзейсныя меры абароны беларускіх суб'ектаў гаспадарання. У такім жа ключы трэба працаваць і над абнаўленнем антыманапольнага заканадаўства.

Важкі пакет дакументаў звязаны з забеспячэннем рэфармавання судовай сістэмы. Асноўная ўвага тут будзе ўдзелена канстытуцыйнаму судаводству, інстытуту медыяцыі, натарыяту і натарыяльнай дзейнасці. Сярод задач, якія нам трэба будзе вырашаць у галіне дзяржаўнага будаўніцтва, я вылучыў бы карэкціроўку выбарчага заканадаўства. Акрамя таго, у нашых планах разгляд пытання, звязанага з удасканаленнем дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

У Палаце прадстаўнікоў таксама знаходзяцца законапраекты па пытаннях рэгулявання працоўных адносін, удасканалення аховы працы, міграцыйнай палітыкі. Пры іх падрыхтоўцы варта не толькі забяспечыць абарону інтарэсаў працоўных, але і не затармазіць пры гэтым развіццё бізнэсу, у першую чаргу малога і сярэдняга. Без дэталёвай прапрацоўкі гэтых пытанняў з прадстаўнікамі дзелавых колаў, прафсаюзамі, экспертамі вырашыць гэту задачу на належным узроўні будзе вельмі праблематычна і складана.

І ў цэлым патрабаванні да якасці заканадаўчай дзейнасці будуць толькі павышацца. Таму асаблівую ўвагу трэба звярнуць на праект Закона «Аб прававых актах Рэспублікі Беларусь», прызначанага стаць своеасаблівай канстытуцыяй для ўсіх удзельнікаў заканатворчага працэсу. Не менш важная і карэкціроўка Рэгламенту Палаты прадстаўнікоў. Ад таго, наколькі прынцыпова, зацікаўлена, удумліва мы паставімся да падрыхтоўкі гэтых дакументаў, будзе залежаць эфектыўнасць усёй нашай далейшай работы.

Пераходзячы да іншых напрамкаў парламенцкай дзейнасці, хачу адзначыць, што дэпутаты арганічна, без развагушвання ўключыліся ў міжнародную дзейнасць. Сфарміраваны 13 дэлегацый Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у міжнародных парламенцкіх арганізацыях, 50 рабочых груп па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў, а таксама міжпарламенцкія камісіі па супрацоўніцтве з Нацыянальным Сходам Рэспублікі Арменія і Вярхоўнай Радай Украіны.

Такім чынам, у нас ёсць патэнцыял для вырашэння задач, якія стаяць у гэтай сферы перад Парламентам. Але гэта не значыць, што мы будзем працаваць на стыхійнай аснове. Мы дзейнічаем планава, у агульным рэчышчы знешняй палітыкі беларускай дзяржавы.

Безумоўным прыярытэтам тут з'яўляецца Саюзная дзяржава. І таму адным з важнейшых міжнародных мерапрыемстваў для нас стала сорак трэцяя сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, праведзеная ў г. Маскве. Саюзныя парламентарыі прынялі ключавыя рашэнні па дакументах бюджэтнага блока. Нягледзячы на няпростыя эканамічныя ўмовы, параметры бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2013 год захоўваюцца на ранейшым узроўні і складаюць практычна 5 млрд расійскіх рублёў. Гэтыя значныя сродкі плануецца накіраваць на фінансаванне сумесных праграм і мерапрыемстваў у перспектыўных сферах беларуска-расійскага ўзаемадзеяння.

У плане двухбаковых адносін нельга не адзначыць візіт дэлегацыі Расійскай Федэрацыі на чале з першым намеснікам старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Мельнікавым Іванам Іванавічам для ўдзелу ў першым пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў. У сваю чаргу намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Гумінскі Віктар Аляксандравіч прыняў удзел у першым Міжнародным парламенцкім форуме «Сучасны парламентарызм і будучыня дэмакратыі», які прайшоў у сталіцы Расіі.

У час сесіі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў актыўна ўдзельнічалі ў мерапрыемствах па лініі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, Парламенцкай Асамблеі АДКБ і Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, у міжнародным назіранні за парламенцкімі выбарамі ва Украіне.

У Палаце прадстаўнікоў праведзена каля дзясятка сустрэч з парламентарыямі, дэлегацыямі дзяржаўных органаў і прадстаўнікамі дыпламатычных місій замежных дзяржаў.

Міжнародная праграма на міжсесійны перыяд таксама ахоплівае ўвесь спектр міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Яна будуецца на прыярытэтах дзяржавы, задачах, пастаўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку развіццё адносін з дзяржавамі АСЕАН.

Ужо сёння вядзецца падрыхтоўка візіту парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Камбоджу. Плануецца, што нашу краіну наведаюць парламенцкія дэлегацыі Інданезіі, шэрагу іншых замежных дзяржаў.

Дэпутаты прымуць удзел у зімовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, планавых мерапрыемствах парламенцкіх арганізацый, створаных на постсавецкай прасторы. Прадоўжыцца работа і па лініі Міжпарламенцкага саюза, Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя, парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, іншых міжнародных арганізацый.

Сесійны перыяд быў адзначаны даволі інтэнсіўнай работай дэпутатаў у выбарчых акругах. Яе вынікі знайшлі свой працяг у актыўным дыялогу з урадам тут, у Авальнай зале. Было ўзнята шмат вострых, надзённых пытанняў, закранаючых інтарэсы як рэгіёнаў, так і краіны ў цэлым.

І такую практыку трэба прадаўжаць. Пры гэтым наш прамы абавязак — прыкласці максімум намаганняў для таго, каб вырашэнне кожнай узнятай праблемы незалежна ад яе значнасці было даведзена да канца. Кожнае наша слова павінна падмацоўвацца рэальнай справай. Працаваць з яшчэ большай аддачай, працаваць на максімальны вынік — менавіта гэтага чакаюць ад нас выбаршчыкі.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за плённую працу і павіншаваць усіх прысутных у гэтай зале з надыходзячым Новым годам і калляднымі святамі.

Традыцыйна Новы год лічаць сямейным святам. А хіба мы з вамі тут не сям'я? Няхай парламенцкая, але сям'я! І чатыры гады мы будзем працаваць разам адным дружным калектывам, каб апраўдаць хоць крыху тых чаканняў, якія людзі звязваюць з гэтымі светлымі святамі.

І кожны з нас поўны такіх чаканняў. Жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў у працы на карысць беларускага народа.

Шчасця вам і вашым блізкім!

## Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі правядзенне чарговага пасяджэння ВДС і баланс паставак нафты ў 2013 годзе

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на сустрэчы ў Маскве 19 снежня абмеркавалі правядзенне чарговага пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы і баланс паставак нафты ў 2013 годзе.**

«Абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва. У прыватнасці, прэзідэнты абмеркавалі правядзенне чарговага пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. У ходзе гутаркі быў закрануты шэраг пытанняў эканамічнага ўзаемадзеяння», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Там удакладнілі, што кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі выдзяленне Беларусі чарговага траншу крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, пытанні супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы, у тым ліку фарміраванне балансу нафты і нафтапрадуктаў у 2013 годзе.

Прэзідэнты абмеркавалі беларуска-расійскае ўзаемадзеянне ў сферы экспарту калійных угнаенняў, а таксама актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, якія маюць узаемны інтарэс.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПЯТАЕ СКЛІКАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ ЗАВЯРШЫЛА ПЕРШУЮ СЕСІЮ

**На заключным пасяджэнні ў Палаце прадстаўнікоў былі разгледжаны 3 законапраекты, у Савеце Рэспублікі — 13.**

Абедзве палаты парламента пагадзіліся з прапановай Выдавецкага дома «Звязда» перайменаваць газету «Местное самоуправление» на «Мясцовае самакіраванне».

— Гэтая прапанова абгрунтавана тым, што газета «Местное самоуправление» апошні час выходзіць толькі на беларускай мове, да таго ж яе атрымліваюць падпісчыкі беларускамоўнай газеты «Звязда», ды і робіць яе калектыў «Звязды», — патлумачыла просьбу выдавецкага дома **дэпутат Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Алена БЕРАСНЕВА.** — Да таго ж жаданне змяніць назву на беларускамоўную выказваюць чытачы.

Палата прадстаўнікоў разгледзела ў першым чытанні законапраекты «Аб канцэсіях» і «Аб энергазберажэнні», прычым апошні выклікаў шмат пытанняў. Адразу было вырашана, што да другога чытання дакумент будзе ў многім дапрацаваны. Савет Рэспублікі ўхваліў праекты законаў аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, і аб выдавецкай справе, а таксама папраўкі і змяненні ў шэраг іншых законаў і некалькі ратыфікацый міжнародных пагадненняў. Наступная сесія Нацыянальнага сходу адкрыецца 2 красавіка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Сувязь падаражэе

Кампанія «Белтэлекам» інфармуе, што ў сувязі з унясеннем змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь, з 1 студзеня 2013 паслугі сувязі, якія аказваюцца фізічным асобам, не будуць вызваляцца ад падатку на дабаўленую вартасць. У сувязі з гэтым кошт паслуг сувязі — мясцовай, міжгародняй і міжнароднай тэлефоннай сувязі, даведачна-інфармацыйных паслуг, паслуг сеткі перадачы даных, byfly, ZALA і іншых — павялічыцца на памер падатку. Раней аб дабаўленні да кошту сваіх паслуг 20% ПДВ паведамілі мабільныя аператары МТС, Velcom і Life:).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «СІТУАЦЫЯ З РАСЧЫСТКАЙ ВУЛІЦ УЗЯТАЯ ПАД КАНТРОЛЬ»

**У рэдакцыі традыцыйна прагучалі першыя — цалкам прадказальныя ў цяперашніх умовах надвор'я, — званкі са скаргамі. Датычыліся яны расчысткі дарог. Ад імя жыхароў усёй вёскі Навасады Воранаўскага раёна першым з заяўнікаў на «гарачую лінію» нашай газеты дазваніўся Леанід Іосіфавіч Вільчэўскі.**

— З нядзелі не расчышчаюць снег — і да вёскі, і ў ёй самой. А гурбы ў нас — упоравень з платамі. Цэнтральную трасу чысцяць, а пад'езд да Навасадаў ад яе на 300 метраў, ды саму вуліцу працягласцю метраў на 500 чамусьці не могуць. Хоць дарогу да фермаў расчышчаюць. А мы што, не людзі? Малако ад насельніцтва не забіраюць ужо тыдзень. Учора не прыйшла аўтакрама. Мой сын-трэцякласнік тры дні як сядзіць дома. Людзі пенсію не атрымалі. Хто можа дабрацца да сельскага Савета, заходзіць, скардзіцца. Ды карысці? Адказваюць, што тэхнікі няма. Яе выдзяляе мясцовае СВК «Місевічы». Вёска наша невялікая, крыху больш за 30 дамоў, не ва ўсіх пастаянна жывуць, але што з таго? — прасіў дапамагчы Леанід Іосіфавіч. — Калі канец свету абяцаюць 21 снежня, дык у нас, можна сказаць, ён ужо надыходзіць.

Вялікая або малая вёска — па вялікім рахунку, значэння не мае. Людзі маюць права разлічваць на дапамогу і павінны атрымліваць яе. Пажадана, як мага хутчэй. Але не трэба забывацца і пра аб'ектыўныя фактары. Тое, што былі моцныя працяглыя снегапады, што ў адзін момант расчысціць абсалютна ўсе дарогі і вуліцы папросту немагчыма. Нават у Мінску — з яго рэсурсамі — не ўсё зараз так гладка ў прамым сэнсе слоў. Ды што казаць, такая краіна з магутнай эканомікай, як ЗША, падчас надзвычайных прыродных з'яў таксама робіцца бездапаможнай. Гэта — не ў апраўданне сітуацыі, а дзеля яе разумення.

Пагаварыць па тэлефоне са старшынёй Місевіцкага сельскага Савета ў нас не атрымалася. Але работніца, што зняла трубку, пацвердзіла, што такіх снегападаў у іх даўно не памятаюць, снегу вельмі шмат. «Расчысцяць, абавязкова расчысцяць дарогу», — аптымістычна напрыканцы заключыла суразмоўца.

**Галоўны інжынер СВК «Місевічы» Станіслаў Бундзелеў** таксама пацвердзіў інфармацыю, што працы па расчыстцы вельмі шмат: «Малако не можам забраць з 15-ці фермаў».

**Намеснік старшыні Воранаўскага райвыканкама Уладзімір Азерскі** ў тэлефоннай гутарцы сказаў, што цэнтральныя дарогі павінны расчышчацца сіламі ДРБУ. А ў таго — толькі 12 адзінак тэхнікі, яно не спраўляецца. У астатнім павінны дапамагаць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.

— Літаральна сёння старшыня райвыканкама загадаў узяць расчыстку дарог пад асаблівы кантроль, гаспадаркі павінны дапамагаць у гэтай справе. Было таксама аддадзена распараджэнне, каб зрабілі праезды для аўтакрам, — сказаў Уладзімір Уладзіслававіч.

Напрыканцы размовы намеснік старшыні райвыканкама паабяцаў асобна ўзяць «на аловак» пытанне па вёсцы Навасады, зазначыўшы, што дарогу там расчысцяць. Мы зноў пагаварылі пра аб'ектыўныя фактары кшталту вялікіх снегападаў, і ў кантэксце гэтага суразмоўца заўважыў, што, на жаль, для некаторых службаў зіма, як той казаў, магчыма, зноў надышла раптоўна...



Фота БЕЛТА.

**P.S.** *Праз некалькі гадзін патэлефанаваў **Віктар Генрыхавіч Верштуновіч** з вёскі Зацішак Валожынскага раёна. Яго скарга мала чым адрознівалася ад слоў папярэдняга заяўніка: вуліцы не чысцяць не толькі ў іх населеным пункце, але і ў іншых побач. Усё гэта, па словах суразмоўцы, працягваецца з панядзелка. «Хлеба не вязуць»... Чытач між іншым заўважыў, што некалькі гадоў таму ў падобных жа ўмовах ужо звяртаўся ў «Звязду».*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Футбол

## БАТЭ ДАСТАЎСЯ «ФЕНЕРБАХЧЭ»

**У штаб-кватэры УЕФА ў швейцарскім Ньёне ў чацвер адбыліся жараб'ёўкі найбуйнейшых еўрапейскіх футбольных турніраў. Чэмпіён Беларусі барысаўскі БАТЭ ў 1/16 фіналу розыгрышу Лігі Еўропы згуляе з турэцкім клубам «Фенербахчэ» са Стамбула.**

14 лютага 2013 г. барысаўчане прымуць саперніка на сваім полі, а 21 лютага згуляюць на выездзе. У сувязі з рэканструкцыяй мінскага стадыёна «Дынама» БАТЭ, хутчэй за ўсё, згуляе на гродзенскім стадыёне «Нёман». «Фенербахчэ» з'яўляецца адным з самых тытулаваных Турцыі — ён 18 разоў станавіўся чэмпіёнам і 5 разоў выйграваў нацыянальны Кубак. БАТЭ ў другі раз выступіць у 1/16 фіналу Лігі Еўропы. Упершыню гэта здарылася ў сезоне 2010/2011, калі барысаўская дружына двойчы згуляла ўнічыю з французскім клубам «Пары Сен-Жэрмен» — 2:2 (дома) і 0:0 (у гасцях).

Там жа ў Ньёне адбылася жараб'ёўка і 1/8 фіналу розыгрышу футбольнай Лігі чэмпіёнаў. Ужо ў першым раўндзе плэй-оф Лігі жэрабя звёў дзве з мацнейшых каманд Еўропы — іспанскі «Рэал» і англійскі «Манчэстэр Юнайтэд». Склады астатніх пар: «Валенсія» — «Пары Сен-Жэрмен», «Баварыя» — «Арсенал», «Мілан» — «Барселона», «Шахцёр» — «Барусія Д», «Галатасарай» — «Шальке-04», «Селтык» — «Ювентус», «Порту» — «Малага». Гульні 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў пройдуць 12/13 і 19/20 лютага 2013 года, а таксама 5/6 і 12/13 сакавіка 2013 года.

**Іван КУПАРВАС** ■

■ Надвор'е

## ЗАСНЕЖЫЦЬ ДЫ І ЗАМАРОЗІЦЬ ДА МІНУС 25

ПРАГНАЗУЕМЫ ТЭМПЕРАТУРНЫ ФОН НА ВЫХАДНЫЯ БУДЗЕ НА 8—13 ГРАДУСАЎ НІЖЭЙ ЗА КЛІМАТЫЧНУЮ НОРМУ

**У пятніцу наша краіна застанецца на перыферыі арктычнага антыцыклону з цэнтрам над Кіраўскай вобласцю Расіі. Таму месцамі пройдзе невялікі снег, на дарогах галалёдзіца, тэмпература 9—15 марозу, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

А вось у суботу і нядзелю на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць вільготныя паветраныя масы з боку Чорнага мора. Пры гэтым у суботу паўсюдна, а ў нядзелю ў паўднёвых і цэнтральных раёнах пройдзе снег, месцамі завіруха. У ноч на суботу тэмпература паветра складзе мінус 10—17, на паўночным усходзе пры праясненнях будзе 18—20 марозу, удзень — ад мінус 8 да мінус 14 градусаў. У нядзелю стане крыху халадней, бо чакаецца мінус 10—17 на працягу сутак, а ўначы пры праясненнях — нават да 18—22 марозу.

Прагназуецца, што 24—25 снежня наша краіна трапіць пад уплыў сапраўды халоднага антыцыклону, што рухаецца з боку Ленінградскай вобласці на цэнтральныя раёны еўрапейскай Расіі. Разам з тым, 25 снежня ў заходнія рэгіёны Беларусі прыйдзе атмасферны фронт з Заходняй Еўропы. Маразы яшчэ ўзмоцняцца.

У панядзелак у асобных раёнах невялікі снег. Будзе ісці снег на захадзе Беларусі і ў аўторак, дзе ўзмоцніцца вецер, парывамі да 15—20 м/с. На працягу сутак 24 снежня чакаецца мінус 13—20 градусаў, уначы, пры праясненнях — да 21—25 марозу. У ноч на аўторак зноў мінус 13—20, а на ўсходзе пры праясненнях да 21—25 марозу. Удзень 25 снежня крыху адпусціць ад мінус 4 градусаў на захадзе да 15 марозу на ўсходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, маразы пачнуць слабець ужо 26 снежня. Аднак у многіх раёнах будзе ісці снег, мяцеліца, а на дарогах — снежныя заносы. Прагназуецца, што ўдзень у сераду будзе ад 0 на захадзе краіны да мінус 7 градусаў на ўсходзе Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### А на Новы год нам абяцаюць казачнае надвор'е...

**«На галоўнае свята года беларусаў чакае камфортнае і спакойнае надвор'е», — такі смелы доўгатэрміновы прагноз агучыў учора начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ. Мяркуецца, што ў навагоднюю ноч тэмпература паветра складзе мінус 3—8 градусаў, а ўдзень будзе толькі 1—6 марозу. Прагназуецца невялікі кароткачасовы снег і слабы вецер. Пабачым і... спадзяёмся.**

■ Ну і ну!

## Крадуць люкі!

**Каля 250 ліўневых рашотак і каля 90 накрывак каналізацыйных люкаў бясследна зніклі з гарадскіх вуліц у гэтым годзе.**

Як паведаміла начальнік аддзела тэхнічнага нагляду па бягучым рамонце і ўтрыманні ГВА «Гаррэмаўтадар Мінгарвыканкама» Марыя Еўсікава, найбольшая колькасць крадзяжоў зафіксавана ў Фрунзенскім, Кастрычніцкім, Партызанскім і Заводскім раёнах сталіцы. Гарадской гаспадарцы нанесена немалая шкода, бо рашотка дажджавога калодзежа зараз каштуе 773 тыс. рублёў, а камплект каналізацыйнага люка — 935 тыс. рублёў.

**Аляксандр ЛЯЎКЕВІЧ, «Мінск—Навіны».**

■ Здаровае харчаванне

# «ГОРКУЮ» ТЛУСТЫМ — НЕ ЗАЯДАЦЬ!

**Здароваму харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай галоўнага навуковага супрацоўніка аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні, доктара медыцынскіх навук Элеаноры КАПІТОНАВАЙ.**

## З ЯКІМІ ПРАДУКТАМІ СПАЛУЧАЕЦЦА ШАМПАНСКАЕ?



— Шампанскае — гэта лёгкае пеністае віно рознай ступені салодкасці. Салодкае шампанскае звычайна падаюць да дэсерту — фруктаў, клубніц, бісквіту, шакаладу. Паўсухое і сухое можна выкарыстоўваць у якасці аперытыву, для ўзняцця апетыту і «запуску» стрававання. У гэтым выпадку да шампанскага можна падаць ікру, сухое пячэнне, рыбапрадукты на шпажках.

У нас чамусьці адсутнічае традыцыя з шампанскага пачынаць святочнае застолле, і тады атрымліваецца, што шампанскае закусваюць living рознымі салатамі, мясной нарэзкай, а тое і гарачымі мяснымі стравамі. Але халодны газіраваны напой, якім з'яўляецца шампанскае, трапіўшы ў страўнік разам з тлустай закускай, можа «дапамагчы» ёй «праваліцца» ў ніжнія аддзелы стрававальнага тракту, і тады дыскамфорт у жываце забяспечаны. Таму шампанскае спалучаецца лепш за ўсё з лёгкімі закускамі і стравамі, лепш рыбнымі.

## ЦІ ВАРТА ЗАЯДАЦЬ ТЛУСТЫМ МОЦНЫ АЛКАГОЛЬ?

— Існуе меркаванне, што калі заядаць моцны алкаголь тлустай ежай, то ап'яненне наступае больш павольна і можна «пратрымацца» даўжэй, будучы ў больш-менш адэкватным стане. Тэарэтычна гэта так: тлушч перашкаджае ўсмоктванню алкаголю ў страўніку. Але на практыцы «грымучая сумесь» з моцнага алкаголю і тлустай ежы можа скончыцца для «актыўнага спажыўца» як мінімум рэанімацыйнай палатай.

Справа ў тым, што алкаголь стымулюе выпрацоўку стрававальных сакрэтаў, у тым ліку і сакрэту падстраўнікавай залозы. З іншага боку, этанол (спірт) зварочвае бялкі, і ў пратоках падстраўнікавай залозы могуць утварацца «пробкі», якія парушаць адток ферментаў. Тады ферменты пачынаюць ператраўліваць не ежу, а тканку падстраўнікавай залозы — адбываецца так званы аўтоліз тканак падстраўнікавай залозы. Калі такі працэс пачынаецца, то медыцына можа і не паспець. Таму лепш за ўсё трымацца залатога правіла: ва ўсім трымацца меры — і ў ежы, і, асабліва, у выпіўцы.

## КОЛЬКІ ЦЫТРУСАВЫХ МОЖНА З'ЕСЦІ НА ПРАЦЯГУ ДНЯ?

— Усё залежыць ад арганізма канкрэтнага чалавека. Калі ёсць алергічныя рэакцыі на цытрусавыя, то і ад адной долькі можна атрымаць анафілактычны шок. Або, напрыклад, у чалавека — хранічны гастрыт, а ён з'еў палову лімона. Абвастрэнне забяспечана. Калі чалавек здаровы, то ён можа ўжываць цытрусавыя, як і яблыкі або іншыя фрукты, без рызыкі для здароўя. Але ўсё ж такі пачуццё меры павінна прысутнічаць заўсёды. Бо ў арганізма можа не хапіць патрэбных ферментаў, калі чалавеку ўздумаецца харчавацца толькі апельсінамі або грэйпфрутамі, і тады праблем не пазбегнуць.

## ЦІ САПРАЎДЫ ТОРТ ТРЭБА ЕСЦІ ПАСЛЯ АСНОЎНАЙ ЕЖЫ?

— У еўрапейскай кухні дэсерт прынята падаваць самым апошнім са страў, разам з чаем, кавай, салодкімі вінамі, лікёрамі. Але дэсерт — неабавязкова торт, а калі і торт, то ён можа быць і лёгкім — з фруктамі і жэле, з тварожна-фруктовай начынкай і г.д. Дый ужываць торт зусім не абавязкова. А вось завяршыць прыём ежы фруктамі вельмі карысна для стрававання.

## ЦІ МОЖНА ПАСЛЯ ПЕРАЯДАННЯ РАТАВАЦЦА ФЕСТАЛАМ?

— Фестал — ферментны прэпарат, які дапамагае ежы ператраўлівацца. Таму цяжар і дыскамфорт пасля празмернай ежы сапраўды можна зменшыць, калі дапамагчы страваванню прыёмам фесталу. Але для гэтага адной таблеткі можа аказацца мала. Часам неабходна прымаць да 4-6 таблетак, і баяцца гэтага не трэба.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

# Падаткі для малога бізнэсу на вёсцы будуць зніжацца

**Пра гэта ўчора паведаміла намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Эла СЯЛІЦКАЯ. Прадстаўнік падатковай галіны адзначыла, што дзяржаўныя структуры будуць і надалей ажыццяўляць пэўныя захады для падтрымкі малога бізнэсу. У першую чаргу гэта датычыцца тых мер, якія паспрыяюць актывізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці ў сельскай мясцовасці.**

Напрыклад, з першых дзён наступнага года ўзровень падатковага цяжару знізіцца для тых плацельшчыкаў, якія выкарыстоўваюць схему спрошчанага падаткаабкладання. Плануецца, што ўжо з 1 студзеня стаўка падатку для вясковых прадпрымальнікаў будзе зменшана на 2%. Такім чынам, для арганізацый, што выкарыстоўваюць рэжым спрошчанага падаткаабкладання, стаўка падатку складзе 5%, калі дзейнасць ажыццяўляецца без ПДВ, і 3% — пры аплаце падатку на дабаўленую вартасць.

Больш за тое, у наступным годзе будуць перагледжаны ўмовы, пры якіх арганізацыі карыстаюцца рэжымам спрошчанага падаткаабкладання. Цяпер валавая выручка такіх структур малога бізнэсу не павінна быць больш як 8,2 млрд рублёў, а колькасць работнікаў — да 50 чалавек. Сёлета падобны крытэрый складае 3,4 млрд рублёў выручкі, а колькасць работнікаў — да 15 чалавек. Плануецца, што такія меры паспрыяюць больш актыўнаму развіццю малога бізнэсу. Увогуле, Эла Сяліцкая адзначыла, што падатковая нагрузка на валавы ўнутраны прадукт краіны ў наступным годзе знізіцца да 27,6% без уліку адлічэнняў у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже недвижимого имущества, находящегося в государственной собственности**

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | Капитальное строение |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская область, Малоритский район, Олтушский с/с, д. Радеж, ул. Молодежная, д. 20 |
| **Продавец недвижимого имущества** | Сельскохозяйственное республиканское дочернее унитарное предприятие «Радежское» транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги», тел.(01651) 3 71 66, (0162) 26 02 94 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Здание КБО, 1-этажн., 1986 г.п, общ. площадь – 174,9 кв.м. Земельный участок площадью 0,0768 га, использовать для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли, услуг и других целей, не запрещенных законодательством с соблюдением природоохранных, экологических, противопожарных и других условий; срок аренды – 50 лет |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка** | - осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Малоритского районного исполнительного комитета о передаче победителю аукциона земельного участка государственной регистрации права на земельный участок |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 14 061 127 (начальная цена понижена на 50 процентов) |
| **Задаток для участия в аукционе, руб.** | 2 812 000 |
| **Организатор аукциона** | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 21 19 82, 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78, www.brest-region.by, www.gki.gov.by |

Аукцион проводится **25 января 2013 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

*Для участия в аукционе организатору аукциона подается*:

Заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

*документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка* на р/с 3642941148018 дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области (код 739), получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе;

*юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем* – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

*иностранным юридическим лицом* – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

*иностранным гражданином или лицом без гражданства* – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

*представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)* – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

*консолидированными участниками* – копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов предъявляется:

заявителем (его представителем) – документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия;

уполномоченным лицом консолидированных участников (его представитель) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

При подаче заявления с приложением необходимых документов с организатором аукциона заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовке и проведения аукциона по установленной форме.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол в день аукциона; в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, представить организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копии платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, и с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Земельный участок предоставляется победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 24 января 2013 года включительно.


■ У свеце

# ЦЯЖКІЯ ПЕРШЫЯ КРОКІ НОВАГА ЎРАДА ЛІТВЫ

**У Літве пачаў сваю работу новы, 16-ы ўрад. Спачатку зноў новаабраны Сейм ухваліў праграму новага кабінета міністраў, які цяпер будзе ўзначальваць сацыял-дэмакрат Альгірдас Буткявічус. «За» галасавалі прадстаўнікі кіруючай большасці — сацыял-дэмакраты, члены фракцыі Партыі працы і фракцыі «Парадак і справядлівасць», Выбарчай акцыі палякаў Літвы. «Супраць» галасавалі кансерватары і лібералы, устрымаліся члены фракцыі Шлях смеласці і Змешанай групы парламентарыяў.**



Новага прэм'ера Літвы, сацыял-дэмакрата Альгірдаса Буткявічуса чакаюць нялёгкія выпрабаванні.

Стварэнне новага ўрада зацягнулася з-за пазіцыі прэзідэнта Літвы. Даля Грыбаўскайтэ пасля выбараў у Сейм заявіла, што не пусціць у новы ўрад міністраў, якія прадстаўляюць кіраўніцтва Партыі працы. Прычына такой рэзкай заявы — крымінальная справа ў дачыненні да старшыні гэтай партыі Віктара Успаскіх, яго намесніка Вітаўтаса Гапшыса і казначэя Віталіі Ванжутайтэ. Падставай для разбору стала падазрэнне ў вядзенні «чорнай бухгалтэрыі». Вышэйназваныя палітыкі (усе трое) абраны і ў новы Сейм. А сацыял-дэмакраты, якія перамаглі на выбарах, змогуць забяспечыць сабе большасць, толькі прыняўшы ў кіруючую кааліцыю Партыю працы. У працэсе перамоў і кампрамісаў склад новага ўрада быў узгоднены, Але Віктару Успаскіх давялося развітацца з надзеяй стаць міністрам.

Левацэнтрысцкі ўрад Літвы сваёй галоўнай мэтай абвясціў курс на стварэнне дзяржавы дастатку шляхам змяншэння сацыяльнага разрыву, падатковай рэарганізацыі, сутнасць якой — «раўнамернае размеркаванне падатковага цяжару паміж працай і капіталам, павелічэнне прагрэсіўнасці падаткаабкладання даходаў і маёмасці, прымяненне толькі сацыяльна значных і мэтавых падатковых ільгот».

**Крытыка папярэдняга ўрада ўсяляе надзею, што новае кіраўніцтва надасць вялікую ўвагу развіццю адносін з суседнімі краінамі, у тым ліку і з Беларуссю. Тым больш, што новым міністрам замежных спраў Літвы стаў Лінас Лінкявічус, які дагэтуль займаў пасаду пасла Літвы ў Беларусі і добра ведае беларуска-літоўскую праблематыку.**

Сярод неадкладных прыярытэтаў урада — праект тэрмінала звадкаванага прыроднага газу ў Клайпедзе. Не сказана катэгарычнае «не» праекту новай Вісагінскай атамнай станцыі, ад якога ў папярэднім варыянце ўрадавай праграмы планавалі адмовіцца з улікам выніку рэферэндуму. У зарэгістраваным у Сейме праекце ўрадавай праграмы падкрэсліваецца, што пры ацэнцы вынікаў рэферэндуму па пытанні будаўніцтва новай АЭС будзе перагледжана нацыянальная стратэгія энергетыкі, у якой будуць ацэнены і «перспектывы ядзернай энергетыкі».

У праграме новага ўрада шмат папрокаў папярэднікам, якімі кіравáў кансерватар Андрус Кубілюс. У ёй гаворыцца, што дзяржаўны доўг Літвы ў час прэм'ерства А. Кубілюса з 17 млрд долараў узрос да 46 млрд. Беспрацоўе за гэты перыяд павялічылася з 6 да 18%. Толькі летась з краіны эмігрыравала ў пошуках працы больш як 54 тыс. чалавек. Працуючым была зменшана зарплата, пенсіянерам урэзаны пенсіі. Паўмільёна гектараў зямлі не культывуецца, яна закінута, бо няма каму яе апрацоўваць. Памылкі кансерватараў давядзецца выпраўляць.

У праграме новага ўрада гаворыцца, што знешняя палітыка Літвы страціла амбіцыі, якія былі да 2008 года. Асабліва пагоршыліся адносіны з Польшчай. «Астылі» стасункі з краінамі Поўначы. Не было ніводнага візіту ў Літву прадстаўніка высокага рангу з Расіі.

Гэтая крытыка папярэдняга ўрада ўсяляе надзею, што новае кіраўніцтва надасць вялікую ўвагу развіццю адносін з суседнімі краінамі, у тым ліку і з Беларуссю. Тым больш, што новым міністрам замежных спраў Літвы стаў Лінас Лінкявічус, які дагэтуль займаў пасаду пасла Літвы ў Беларусі і добра ведае беларуска-літоўскую праблематыку.

Дарэчы, і новы спікер Сейма Літвы Відас Гедвілас на сустрэчы з пасламі замежных дзяржаў падкрэсліў, што Літва будзе ўмацоўваць добрыя адносіны з суседнімі краінамі.

Цяпер у літоўскай прэсе з'явілася нямала публікацый, прысвечаных 20-годдзю дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Літвой. За гэтыя гады паміж нашымі краінамі ўзніклі цесныя сувязі. Адзін толькі факт, што сёлета тавараабарот паміж Беларуссю і Літвой перавысіць 1,5 млрд долараў, сведчыць пра многае.

Новы ўрад чакае цяжкая праца і ўнутры краіны, і ў міжнародных адносінах.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.**
*г. Вільнюс*

■


**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 25 января 2013 года проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе**

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Минский район, Горанский с/с, д. Падсады | Минский район, Ждановичский с/с, аг. Ратомка, ул. Зеленая | Минский район, г. Заславль, ул. Береговая | Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода | Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Тюленина | Минский район, Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623681316101000031 | 623681708601002821 | 623650100001004474 | 623683903601000064 | 623683403101007424 | 623655500001000303 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 2,0211 га | 0,0217 га | 0,1562 га | 0,0386 га | 0,1000 га | 0,5004 га |
| 4 | **Срок аренды (лет)** | 30 | 30 | 50 | 51 | 30 | 51 |
| 5 | **Целевое назначение** | Для строительства объекта придорожного сервиса | Для установки павильона по ремонту обуви | Для строительства объекта физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения | Для размещения объекта торговли товарами народного потребления | Для строительства административного здания с аптекой и спортивно-оздоровительным комплексом | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения |
| 6 | **Инженерная инфраструктура *** | - | электричество, газ | электричество, газ | - | электричество, газ, водопровод | - |
| 7 | **Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей)** | - | - | 233 310 | 630 300 | - | 8 487 405 |
| 8 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 5 465 849 | 4 824 235 | 2 437 068 | 2 156 134 | 4 177 366 | 1 827 820 |
| 9 | **Начальная цена права заключения договора аренды** | 16 279,15 доллара США | 1 677,22 доллара США | 31 529,77 доллара США | 516 долларов США | 6 917,48 доллара США | 35 851,36 доллара США |
| 10 | **Задаток (рублей)** | 27 000 000 | 2 800 000 | 53 000 000 | 850 000 | 11 000 000 | 61 000 000 |

| | | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Минский район, Петришковский с/с, д. Кирши | Минский район, Роговский с/с, район д. Гуя | Минский район, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи | Минский район, Сеницкий с/с, п. Юбилейный | Минский район, Хатежинский с/с, аг. Хатежино |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623685202101000147 | 623685704101000195 | 623685804101000044 | 623686303601000866 | 623686607601000384 | 623687508101001270 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 0,1200 га | 0,0500 га | 0,1820 га | 0,0272 га | 0,0040 га | 0,0682 га |
| 4 | **Срок аренды (лет)** | 50 | 30 | 30 | 30 | 30 | 30 |
| 5 | **Целевое назначение** | Для строительства магазина | Для строительства торгового объекта | Для строительства кафе | Для строительства торгового объекта | Для размещения торгового павильона | Для строительства объекта торговли |
| 6 | **Инженерная инфраструктура *** | электричество | электричество, водопровод | - | электричество, газ, водопровод, канализация | электричество, газ, водопровод, канализация | электричество, газ, водопровод |
| 7 | **Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей)** | 5 320 120 | - | - | - | - | 7 612 770 |
| 8 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 2 135 869 | 5 553 504 | 6 290 950 | 4 908 199 | 1 783 444 | 6 540 617 |
| 9 | **Начальная цена права заключения договора аренды** | 2 903,39 доллара США | 841,51 доллара США | 454,11 доллара США | 848,32 доллара США | 384,40 доллара США | 1 379,63 доллара США |
| 10 | **Задаток (рублей)** | 4 900 000 | 1 400 000 | 750 000 | 1 400 000 | 650 000 | 2 300 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 25.01.2013 г. в 10:00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 21.01.2013 г. в 17:00. Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3641000000223, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, д. 13, к. 2, МФО 153001520, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

● гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

● индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

● представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

● представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

● представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

● представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в аренду единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

**** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.***



ТЕХНОБАНК

**Открытое акционерное общество**
**220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44**

**Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!**

**Настоящим извещаем о проведении внеочередного Общего Собрания акционеров ОАО «Технобанк» в очной форме по решению Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк» от 28.11.2012 (протокол №42)**

на основании собственной инициативы Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк», требования акционеров ОАО «Технобанк» Коцаренко Е.М., Коцаренко В.А., Тыц Н.Л., обладающих в совокупности не менее чем 10 процентами голосов от общего количества голосов акционеров банка, от 15.11.2012 о проведении внеочередного Общего Собрания акционеров.

**Дата проведения: 28 декабря 2012 года.**

**Место проведения (адрес):** г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», 2-й этаж. Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании: с 11.30 до 12.00 по месту проведения собрания при предъявлении документов, подтверждающих их личность (паспорт) и полномочия представителей акционеров (документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; доверенность).

**Время проведения заседания:** с 12.00 до 14.00.

**Повестка дня Общего Собрания акционеров:**

1. Об избрании нового состава Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».

Предоставление для ознакомления информации (документов), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, осуществляется в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, на основании письменного запроса на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании акционеров и(или) их уполномоченных представителей.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010, УНП 100706562*



*УНП 190398583*

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ**
**извещает об отказе от проведения торгов**

по предметам торгов №№ 3, 28, 59 на 131-ом открытом аукционе по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, который назначен на **28 декабря 2012 г.**

Извещение о проведении 131-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, было опубликовано в газете «Минский курьер» 14 декабря 2012 г. и газете «Звязда» 14 декабря 2012 г.

**Телефон для справок (017) 327 40 22. Интернет: www.mgcn.by.**

# Новы год хутка — хуткі крэдыт наяўнымі ад «Хоум Крэдыт Банка»

HOME CREDIT BANK

Напярэдадні Новага года ўсім нам хочацца завяршыць незакончаныя справы — дарабіць рамонт, набыць новую мэблю, абнавіць маральна састарэлы камп'ютар ды яшчэ і падрыхтаваць падарункі да свята для сяброў і блізкіх. Што рабіць, калі на руках няма неабходнай сумы, а патраціць давядзецца шмат? Прыемным падарункам у гэтай сітуацыі стане прапанова «Хоум Крэдыт Банка», які спецыяльна да Каляд і Новага года павялічыў максімальна даступную суму крэдыту наяўнымі для сваіх кліентаў да 25 мільёнаў беларускіх рублёў.

На гэту суму могуць разлічваць асобы, якія раней ужо афармлялі крэдыты ў ААТ «ХКБанк» і маюць па іх станоўчую крэдытную гісторыю ў банку, а таксама работнікі кампаній, якія маюць зарплатныя карткі «Хоум Крэдыт Банка». Ва ўладальнікаў зарплатных картак ёсць дадатковая перавага — тэрмін разгляду іх звароту па крэдыце наяўнымі складае ўсяго 15 хвілін!

Не бяда, калі вы ні разу не карысталіся крэдытнымі прадуктамі банка: для новых кліентаў ААТ «ХКБанк» максімальна магчымая сума крэдыту наяўнымі таксама дастаткова важкая — 20 мільёнаў беларускіх рублёў (пры выдачы даведкі аб даходах і афармленні ў ЦБУ Банка). Калі вам будзе дастаткова 15 мільёнаў рублёў, то і гэтыя фармальнасці становяцца непатрэбнымі: заяву на крэдыт можна пакінуць вусна па тэлефоне гарачай лініі банка (017) 229 89 89.

Вы самі можаце выбраць найбольш зручны спосаб афармлення крэдыту наяўнымі: па тэлефоне або ў адным з 31 цэнтра банкаўскіх паслуг Банка па ўсёй краіне.

Паколькі часта з падарункамі нельга марудзіць, то і чаканне, пакуль Банк разгледзіць заяву і прыме рашэнне пра лёс крэдыту, здасца працяглым. У «Хоум Крэдыт Банка» ёсць цудоўнае выйсце з такой сітуацыі: атрыманне крэдыту наяўнымі на карту імгненнай выдачы! Для атрымання карты вам трэба запоўніць заяву на выдачу крэдыту ў адміністрацыйных пунктах «Хоум Крэдыт Банка» і там жа вам выдадуць картку на працягу гадзіны пасля станоўчага адказу. Адрас бліжэйшага адміністрацыйнага пункта, дзе можна аформіць крэдыт наяўнымі на картку імгненнай выдачы, можна даведацца па тэлефоне гарачай лініі (017) 229 89 89 або на сайце Банка ў раздзеле «Крэдыты».

Вы бясплатна атрымаеце картку міжнароднай плацежнай сістэмы MasterCard Electronic, расплачвацца якой зможаце ў любых крамах і ўстановах сферы паслуг. Таксама прыемнай асаблівасцю карткі ў рамках гэтага крэдыту з'яўляецца тое, што «Хоум Крэдыт Банк» не бярэ плату за зняцце наяўных з дапамогай карткі імгненнай выдачы ў банкаматах!

Такім чынам, з новым крэдытам на картку імгненнай выдачы вы сэканоміце час, якога звычайна не хапае ў перадсвяточнай мітусні, і атрымаеце патрэбную суму без лішніх фармальнасцяў. А час, які вы збераджаце, лепш патраціць на пошук падарункаў і на стасункі з сябрамі і блізкімі.

***Падрабязнасці па крэдыце наяўнымі можна даведацца па тэлефоне гарачай лініі «Хоум Крэдыт Банка» (017) 229 89 89 або на сайце банка www.homecredit.by ў раздзеле «Крэдыты».***



Адкрытае акцыянернае таварыства «Хоум Крэдыт Банк» — адзін з лідараў беларускага рынку спажывецкага крэдытавання. Банк пачаў сваю работу па выдачы крэдытаў фізічным асобам у снежні 2007 г. «Хоум Крэдыт Банк» уваходзіць у склад Групы «Хоум Крэдыт».

Група «Хоум Крэдыт» — гэта вядучы гулец на рынку спажывецкага крэдытавання з шырокай сеткай дыстрыбуцыі ў Расіі (з 2002 г.), Чэхіі (з 1997 г.), Славакіі (з 1999 г.), Беларусі (з 2007 г.) і Казахстане (з 2005 г., мінарытарная доля ўдзелу). Больш падрабязную інфармацыю можна даведацца на сайце www.homecredit.eu.

*ААТ «ХКБанк». Ліцэнзія №18 Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2007 г. Ліцэнзія бестэрміновая. УНП 807000056.*

## Даты Падзеі Людзі



**1796** год — нарадзіўся (вёска Мясата, зараз Маладзечанскі раён) Тамаш Зан, паэт-рамантык, музеязнавец, геолаг, удзельнік вызваленчага руху. Адзін з арганізатараў таварыства філаматаў, стваральнік таварыства прамяністых, рэарганізаванага пазней у таварыства філарэтаў. У 1823 годзе арыштаваны і высланы ў Арэнбург, дзе вёў дзённік, даследаваў прыроду Урала, стварыў мінералагічны музей. З 1841 года жыў у Беларусі. Вывучаў беларускі фальклор. Аўтар паэм «Табакерка», «Мёд», балад «Твардоўскі», «Свіцязь-возера» і іншых. Сябраваў з А. Міцкевічам, аказваў уплыў на яго творчасць. Адыграў значную ролю ў развіцці новага літаратурнага кірунку — рэвалюцыйнага рамантызму. Першым з кола віленскіх паэтаў прызнаў беларускую народную творчасць за адзін з найгалоўнейшых раздзелаў сваёй паэтычнай праграмы. Памёр у 1855 годзе.

**1913** год — Напэўна, мала хто ведае, калі з'явілася першая крыжаванка ў яе сучасным выглядзе. А здарылася гэта ў такі ж дзень 1913 года, калі амерыканская газета «Нью-Ёркс Уорлд» апублікавала слоўную шараду-галаваломку, якая пасля і атрымала гэтую немудрагелістую назву — «крыжаванка». Яе аўтарам быў карэспандэнт газеты Артур Уін, малады журналіст, які эміграваў у Амерыку з Ліверпуля. Аднойчы дома Артур знайшоў у сваёй шафе лісток з дзіўным чынам напісанымі словамі. Пазней ён узгадваў, што гэта былі «магічныя квадраты», ці «магічныя словы» — гульня, вядомая яшчэ з антычных часоў, у якую з ім гуляў у дзяцінстве дзед. Лічылася нават, што «магічныя квадраты» прыносяць поспех, таму старажытныя рымляне часта малявалі іх на сценах сваіх дамоў. Прынцып гульні быў наступным: адны і тыя ж словы размяшчаліся ў разлінеенай сетцы і па гарызанталі, і па вертыкалі, Артур жа крыху ўдасканаліў яе, словам, зрабіў тое, што мы цяпер і называем крыжаванкай.

**1934** год — нарадзіўся (вёска Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна) Іван Чыгрынаў, празаік, драматург, народны пісьменнік Беларусі. Працаваў у выдавецтве «Навука і тэхніка», часопісе «Полымя». Аўтар раманаў «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужыя» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974). Памёр у 1996 годзе.

### Было сказана

**Янка Брыль (1917—2006), народны пісьменнік Беларусі:**

***«У кожнага з людзей свае даліны і ўзгоркі, свая хада па іх, а неба, зорнае неба — адно...».***

# САШЫНА ЎСМЕШКА



Фота БЕЛТА.

**Гэтай спартсменцы я паставіла б помнік ужо зараз. Ісці па жыцці з усмешкай на вуснах — няпроста. А паспяваць пры гэтым заваёўваць медалі, трэніруючыся па паўдня шэсць разоў на тыдзень, знаходзіць у такім цэйтноце час на добрыя ўчынкі, быць заўсёды на віду і заставацца абсалютна шчырым і добразычлівым чалавекам — амаль немагчыма. Але гэта не міф, не казка, а паўсядзённае жыццё двухразовай сярэбранай прызёркі лонданскай Алімпіяды Аляксандры Герасімені.**

Менш чым за месяц Саша паспела бліснуць на еўрапейскім першынстве па плаванні, вярнуўшыся дадому з трыма ўзнагародамі кожнай якасці, і выйграць «золата» чэмпіянату свету ў Стамбуле. Прыляцеўшы з Турцыі, спартсменка сабрала прэс-канферэнцыю, дзе падвяла вынікі сезона і распавяла пра планы на наступны год:

«Як ні дзіўна, але на чэмпіянаце свету я добра адпачыла. Звычайна на спаборніцтвах ні на што не хапае часу, толькі трэніроўкі і выступленні, а ў гэты раз я вельмі камфортна сябе адчувала, паспявала нават высыпацца. Безумоўна, я шчаслівая, што хапіла сіл не толькі на алімпійскі адрэзак, але і на канцоўку сезона. У мяне часта пытаюцца, якая з узнагарод гэтага года самая каштоўная. Гэта ўсё адно, што спытаць у маці, каго са сваіх дзяцей яна любіць больш. Як тут выбраць?! Кожная перамога засталася ў памяці яркім выбліскам, незабыўным успамінам. Да канца гэтага года ў мяне яшчэ запланавана выступленне на міжнародным турніры імя Уладзіміра Сальнікава ў Санкт-Пецярбургу. А потым буду рыхтавацца да сустрэчы Новага года. У гэты раз вырашыла святкаваць дома з роднымі і блізкімі. Даўно такога не было, трэба вяртацца да добрай традыцыі. У наступным годзе хачу ўзяць невялікую паўзу. Буду адпачываць, вучыцца, займуся асабістым жыццём. Хутчэй за ўсё, прапушчу чэмпіянат свету, а вось на летнюю Універсіяду ў Казані абавязкова паеду. Гэтыя спаборніцтвы для мяне — святое».

Напрыканцы Аляксандра, як і паабяцала на нядаўнім ушанаванні алімпійцаў, уручыла ўзнагароды лепшым спартыўным журналістам года. На працягу тыдня на сайтах pressball.by і tut.by ішло галасаванне, па выніках якога вышэйшую адзнаку сваёй творчасці атрымаў журналіст газеты «Прессбол» Сяргей Новікаў. Акрамя гэтага, алімпійская прызёрка адзначыла прафесійнае майстэрства Юрыя Міхалевіча, Ганны Эйсмант і Сяргея Вярсоцкага, падарыўшы журналістам памятныя сувеніры.

Пасля прэс-канферэнцыі ўдалося задаць Сашы некалькі пытанняў.

**— У тваім жыцці вялікае месца займае дабрачынны праект «Мары збываюцца». Раскажы, калі ласка, пра гэту ініцыятыву?**

— Праект прыдумалі разам з сябрамі і калегамі. Падтрымліваем хворых дзетак і іх бацькоў, наведваем выхаванцаў дзіцячых дамоў — увогуле дапамагаем тым, хто мае патрэбу ў гэтым. Я вельмі ўдзячна кожнаму, хто далучыўся да нашай вялікай сям'і, насамрэч неабыякавых людзей у нас хапае. Вядома, ёсць пэўныя цяжкасці. Паступова выводзім праект на міжнародны ўзровень. Хацелі правесці акцыю ў Лондане пасля Алімпіяды, але не атрымалася. Было шмат няўвязак, праблем з візамі... Але мы стараемся і далей развівацца ў гэтым напрамку.

**— Не ўсе публічныя людзі афішуюць сваю дабрачынную дзейнасць. А некаторыя, наадварот, робяць усё, што толькі магчыма, каб папулярызаваць падобную ініцыятыву ў грамадстве. Як ты ставішся да гэтага?**

— Я належу якраз да тых, хто не імкнецца афішаваць усе свае справы. Але трэба зразумець, што любая дзейнасць публічных людзей так ці інакш прыцягвае ўвагу, як бы ты ні хацеў штосьці пакінуць у тайне. Аднак і ў гэтым ёсць свае плюсы. Калі наш прыклад можа стаць штуршком для іншых, чаму не?!

**— Не так даўно ты задалася мэтай арганізаваць аматарскі турнір па плаванні для дзяцей. Як ідзе гэтая справа?**

— А вось тут усё выдатна. Мы супрацоўнічаем з Рэспубліканскім цэнтрам адукацыі, ужо рыхтуецца палажэнне, будзем рассылаць па школах, шукаць удзельнікаў. Безумоўна, гэта досыць працяглы працэс. Але зараз я дома і буду кантраляваць развіццё падзей. Думаю, праз некалькі месяцаў — напэўна, увесну — ўжо пачнуцца першыя этапы спаборніцтваў.

**— Трэніроўкі, спаборніцтвы, дабрачынныя праекты, грамадская дзейнасць...**



**У мяне часта пытаюцца, якая з узнагарод гэтага года самая каштоўная. Гэта ўсё адно, што спытаць у маці, каго са сваіх дзяцей яна любіць больш.**

**Гэты спіс можна працягваць. Здаецца, павінна стамляцца, але ты заўсёды ў добрым настроі і з ўсмешкай на твары. У чым твой сакрэт?**

— Часам я аджартоўваюся, што натрэніравала мышцы на твары, вось і не магу перастаць усміхацца *(смяецца)*. Насамрэч у мяне гэта атрымліваецца неяк аўтаматычна, я нават не адчуваю і не заўважаю. Проста люблю сустракацца з людзьмі, размаўляць з імі, абменьвацца ўражаннямі. Ад гэтага атрымліваеш каласальны энергетычны зарад! Вось і з'яўляецца ўсмешка.

**— Кажуць, што ідэальных людзей не бывае. Згодная з гэтым ці паспрачаешся?**

— Абсалютна згодна. І я далёка не ідэал. Як і ў кожнага, у мяне ёсць звычайныя чалавечыя недахопы і слабасці.

**— Якія, напрыклад?**

— Безумоўна, я не стану ў гэтым прызнавацца (смяецца). Калі толькі пра самае бяскрыўднае... Напрыклад, я страшная гультайка. Ніхто не верыць, але гэта так. Таму добра, калі ў мяне шмат нейкіх спраў. Тады ў канцы дня я магу сказаць сабе: «Ну, не так уж я і гультайнічала сёння!»

**— Дарэчы, пра ляноту. Які для цябе самы лепшы рэлакс — пеністая ванна са свечкамі, шопінг ці яшчэ нешта?**

— Не, не, гэта не мой адпачынак. А вось цішыня, утульны пакой і цікавая кніга — іншая справа.

Развітваючыся з Сашай, злавіла сябе на думцы, што ледзь не ўпершыню мне неяк асабліва камфортна і спакойна пасля размовы з вельмі вядомым чалавекам. І самой захацелася ўсміхацца. Ісці па марозным снежным Мінску і проста дарыць усмешку мінакам.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## ■ Добрая справа

### БАБУЛІ ЎНУКАМ — ЦАЦКІ З ЛЁДУ

**Быць ва ўзросце — не значыць забыцца на весялосць і энергічнасць. Найбольш актыўныя пажылыя людзі ў Мінску праводзяць розныя навагоднія акцыі, паведамілі ў Мінгарвыканкаме.**

Напрыклад, у Ленінскім раёне сталіцы 30 снежня ў адным з двароў пройдзе мерапрыемства пад назвай «Бабулі — унукам». Тут будзе ёлка, Дзед Мароз і Снягурка, баяніст, падарункі, для набыцця якіх ужо знойдзены спонсары, і нават незвычайныя ёлачныя цацкі з лёду.

У Заводскім раёне ветэраны вырашылі 27 снежня наведацца ў госці да выхаванцаў сацыяльнага прытулку, а ў Першамайскім раёне плануюць зрабіць навагоднее мерапрыемства ў сваім ветэранскім дворыку.

А вось пажылая жыхарка Фрунзенскага раёна літаральна напярэдадні свят знайшла для сябе прыёмную сям'ю. У жанчыны ёсць родны сын, а кватэра, дзе яна жыве, падорана пляменніку. Але з роднымі неяк не атрымліваецца знайсці паразуменне. Цяпер пра яе клапоціцца абсалютна чужы чалавек. Для гэтага ў раённым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва заключылі дамову паміж бабуляй, яе апякункай і цэнтрам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**






### У СВЯТОЧНЫЯ ДНІ ПРАБЛЕМ З ПАЕЗДКАМІ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ

**Дадатковыя цягнікі будуць курсіраваць па Беларускай чыгунцы ў дні калядных і навагодніх свят.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, з 22 снежня па 8 студзеня прызначаюцца 46 дадатковых цягнікоў для перавозкі пасажыраў унутры краіны. У тым ліку 31 дадатковы цягнік будзе курсіраваць па такім запатрабаваным маршруце, як Мінск — Гомель — Мінск, і 9 паяздоў — па маршруце Мінск — Брэст — Мінск. Таксама дадаткова прызначаны 6 цягнікоў па напрамку Мінск — Пінск — Мінск.

У дні калядных і навагодніх свят па беларускай магістралі будзе курсіраваць больш за 40 дадатковых цягнікоў і ў міжнародных зносінах. У першую чаргу яны будуць перавозіць пасажыраў па маршрутах Мінск — Масква — Мінск, Брэст — Масква — Брэст, Брэст — Санкт-Пецярбург — Брэст.

Апроч гэтага, у «пікавыя» дні перавозак у цягнікі, што запланаваны па графіку, будуць уключацца дадатковыя вагоны.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.26 | 16.49 | 7.23 |
| Віцебск | 9.24 | 16.31 | 7.07 |
| Магілёў | 9.17 | 16.39 | 7.22 |
| Гомель | 9.04 | 16.44 | 7.40 |
| Гродна | 9.40 | 17.06 | 7.26 |
| Брэст | 9.32 | 17.15 | 7.43 |

**Месяц**

***Першая квадра 20 снежня. Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.** Анфісы, Кірылы, Патапа.*
***К.** Пятра, Тамаша, Яна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Адзінае, што ўратуе ад канца свету, — гэта піва на наступную раніцу...**

Расклад на снежаньскія святы:
20 снежня — падрыхтоўка да канца свету.
21 снежня — пачатак канца свету.
22 снежня — афіцыйнае святкаванне канца свету.
23 снежня — канец канца свету.
24 снежня — адпачынак пасля канца свету.
25, 26 снежня — Раство, навагоднія ранішнікі, ёлкі...
31 снежня — Новы год!
3 студзеня 2013 г. — канец свету па старым стылі: -)

**Усім, хто баіцца канца свету: не палохайцеся! 22 снежня — Дзень энергетыка.**

**Яны назад усё падключаць!**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 26.325. Індэкс 63850. Зак. № 5798.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 20 снежня 2012 года.